*Святлоў Барыс Уладзіміравіч,*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, рэктар,
кандыдат філасофскіх навук, дацэнт;

*Голікава Ларыса Фёдараўна,*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
начальнік аддзела менеджменту якасці адукацыі,
кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

## Мастацкая адукацыя і эстэтычнае выхаванне: "Раблемы і перспектывы

*Мастацка-адукацыйны і эстэтычна-выхаваўчы працэсы разглядаюцца як цэласная сістэма мастаіікай адукацыі, якая базіруецца на прынцыпах непарыўнасці і пераемнасці адукацыйпа-выхаваўчай*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*дзейнасці, стварае ўмовы для адукацыі «праз усё жыццё» і забяспечвае выхаванне і падрыхтоўку прафесійных кадраў для сферы культуры і мастацтва.*

Ссння мастацкая адукацыя і эстэтычнае выхаванне выступаюць як праблсмная складаючая сучаснага культурнага працэсу. Асноўнай рысай сітуацыі, якая становіцца ўсё болей відавочнай, з'яўляецца супярэчнасць паміж традыцыйнай своеасаблівасцю сістэмы падрыхтоўкі творчых кадраў (з адпавсднай сістэмай фінасавання) і рынкавымі адносінамі, што няўмольна набліжаюцца, глабалізацыяй культуры. Пры гэтым пануючай думкай сярод мастацкай грамадскасці і некаторых афіцыйных колаў па-рансйшаму застаецца мсркаваннс, што наша мастацкая адукацыя і эстэтычнае выхаванне — гэта сістэма, якая склалася гістарычна і не мае аналагаў у свеце. Яна дае выдатныя вынікі і не патрабуе змянсння ў, хіба што ў частцы ўзору дыплома (даніна так званаму Балонскаму працэсу) аб вышэйшай мастацкай адукацыі. Не аспрэчваючы прынцыпова нашых дасягненняў у разглядасмай сфсры, трэба больш дакладна ўзважыць усе «за» і «супраць» існуючай сістэмы з улікам будучых сацыяльна-эканамічных змен, каб быць гатовымі адказваць на выклікі часу.

Асаблівасцю айчыннай сістэмы мастацкай адукацыі і эстэтычнага выхавання з'яўлясцца яе прыналежнасць да розных ведамстваў: да Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры. Кожнае з іх мас асабістую канцэпцыю развіцця і прыярытэты, мадэлі і метады кіравання. У сфсры культуры функцыянуюць школы мастацтваў, сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы культуры і мастацтваў. Да сфсры адукацыі адносяцца сярэднія школы з мастацкім ухілам, а таксама сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы, у якіх вядзецца падрыхтоўка па асобных дысцыплінах мастацкага цыкла. Дашкольнае выхаванне таксама падпарадкоўваецца Міністэрству адукацыі. Але ж не будзем пакуль што звяртаць увагі на якасныя адрозненні суб'ектаў навучальнага працэсу аднаго і другога ведамства і перанясём акцэнт на колькасныя паказчыкі сістэмы.

Мастацкая адукацыя пачынаецца з эстэтычнага выхавання асобы, якое, у сваю чаргу, пачынаецца з самага ранняга ўзросту. Сёння ў Беларусі вялікая ўвага надаецца эстэтычнаму выхаванню маленькіх. Ужо ў дзіцячых садках выхаванцы робяць псршыя крокі на шляху

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнага развіцця, вывучаюць музыку, спевы, танцы, малюнак, спрабуюць свае сілы ў невялікіх тэатральных спсктаклях. Беларусь — адзіная краіна ў Садружнасці Незалсжных Дзяржаў, дзе дашкольнае выхаванне арганічна ўключана ў нацыянальную сістэму адукацыі нароўні з агульнаадукацыйнай сярэдняй школай, сярэднімі спецыяльнымі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Гэта яскравае сведчанне таго, што выхаванне дашкольнікаў арганічна ўваходзіць у агульную сістэму мастацкай адукацыі як яе важная частка і што дашкольнай адукацыі ў нашай краіне надаецца вялікая ўвага.

Так, у сістэме нашай дашкольнай адукацыі і выхавання задзсйнічана 79,1 % дашкольнікаў (найлепшы паказчык у СНД), з іх 91,4% — дзеці ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў. У 2010 г. колькасць устаноў дашкольнай адукацыі павялічылася на 109 адзінак. Праграма выхавання дзяцей цалкам разлічана на падрыхтоўку да школы.

Наступная ступень мастацкай адукацыі ўключае вучняў школьнага ўзросту. Існуючая колькасць сярэдніх школ, ліцэяў, гімназій-каледжаў, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь, — 3615. Колькасць навучэнцаў у іх на сённяшні дзень у Беларусі складае 940 360. Усе навучэнцы пачатковых, 1-4-х, класаў атрымоўваюць урокі эстэтычнага выхавання — музыкі і выяўленчага мастацтва.

Калі сістэму мастацкай адукацыі ўявіць у выглядзе своеасаблівай піраміды, то яе фундаментам выступае колькасць навучэнцаў пачатковага звяна — школьнікаў (паводе Міністэрства культуры — 104 843, паводле Міністэрства адукацыі — 167 596). Наступны ўзровень прапануемай піраміды адлюстроўвае колькасць школ мастацтваў і сярэдніх школ з эстэтычна-мастацкім ухілам. Пры Міністэрстве культуры дзіцячых школ мастацтваў — 523, пры Міністэрстве адукацыі школ з ухілам — 501. Далей ідуць спсцыяльныя сярэднія навучальныя ўстановы — вучылішчы, калсджы, гімназіі-каледжы, якіх у сістэме Мінкультуры — 21, Мінадукацыі — 5. Вяршыню піраміды ўзначальваюць вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія часткова або цалкам уваходзяць у сістэму мастацкай адукацыі. Пры гэтым Міністэрства культуры мае 3 такія ўстановы, Міністэрства адукацыі — 10.

Такім чынам, сістэма мастацкай адукацыі і эстэтычнага выхавання складаецца з 1024 школ, 26 сярэдніх спецыяльных і 13 вышэйшых навучальных устаноў. Усяго мастацкай адукацыяй ахоплены 272 439 школьнікаў, якія навучаюцца мастацтву як у сістэме агульнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сярэдняй адукацыі, так і ў сістэме мастацкай адукацыі (усяго 29%), — амаль трэць з агульнай колькасці навучэнцаў. Астатнія дзве трэці вывучаюць прадметы мастацтва (музыку і выяўленчас мастацтва) толькі ў пачатковай школе. Аднак далёка не ўсе з гэтых 29% мусяць працягваць сваё навучаннс ў ССНУ.

У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі, у так званых школах з эстэтычна-мастацкім ухілам, у якіх прадметам мастацтва і ўвогуле мастацкай адукацыі ўдзяляецца вялікая ўвага, мастацкімі дысцыплінамі займаецца прыкладна 18% ад агульнай колькасці школьнікаў у краіне. Па відах мастацтва перавага аддаецца харэаграфічнаму мастацтву — ім займасцца 53 484 школьнікі; затым выяўленчаму (50 517); музычнае мастацтва прываблівас 49 407 навучэнцаў; тэатральнае — 12 111 чалавск.

Найбольшая колькасць навучэнцаў мастацтву знаходзіцца ў сярэдніх школах з ухілам г. Мінска — 35 267 і Мінскай вобласці — 27 525. Наймсншая колькасць дзяцей і падлеткаў вывучаюць мастацтва ў Магілёўскай вобласці — 12 270 (7,3% ад агульнай колькасці вучняў школ з ухілам).

Сістэма пачатковай мастацкай адукацыі, якая аб'ядноўвае дзіцячыя школы мастацтваў, музычныя, мастацкія, харэаграфічныя, тэатральныя школы, першапачаткова складвалася ў Рэспубліцы Беларусь з відавочным ухілам у бок музычнай адукацыі. Хаця з года ў год існуюць стабільныя конкурсы на тэатральныя ці харэаграфічныя спецыяльнасці, існуе і вялікая запатрабаванасць у спецыялістах гэтага профілю ў рэгіёнах (асабліва харэографаў), дзіцячых музычных школ у краінс на сённяшні дзень значна больш — 178, а мастацкіх (25), харэаграфічных (9) школ, як і дзіцячых школ іншага профілю (тэатральных, народных рамёстваў, народнага танца, духавых і народных інструмснтаў — 16). — усяго 50.

У апошні час замацоўваецца станоўчая тэндэнцыя пераўтварэння вузкапрофільных школ у школы мастацтваў, што мас рацыю: менавіта школы мастацтваў ажыццяўляюць комплекснае эстэтычнас навучанне і выхаванне дзяцей, забяспечваюць атрыманне імі пачатковых навыкаў прафесійнага мастацтва. За апошнія два гады на 5,4% павялічылася колькасць школ мастацтваў і скарацілася на 9,6% колькасць музычных школ, але дысбаланс яшчэ застаецца. Прыкладна такая ж сітуацыя складваецца і ва ўстановах сярэдніх спецыяльных. Большая частка навучэнцаў ССНУ атрымоўвае музычную адукацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пікантнасць сітуацыі заключаецца ў тым, што дэ-юрэ статус дзіцячых школ мастацтваў, музычных і іншых школ адносіцца да дадатковай адукацыі, і іх мэтай у гэтым выпадку павінна быць масавас эстэтычнае выхаванне. Але ж дэ-факта мснавіта яны «куюць кадры» для сярэдняй спецыяльнай мастацкай адукацыі і выконваюць функцыю стварэння і захавання прафесійнай мастацкай эліты.

Між тым па-ранейшаму нізкім застаецца паказчык прафесійна арыентаваных навучэнцаў у школах музычнага профілю: колькасць дзядей, якія рыхтуюцца да паступлення ў сярэднія спсцыяльныя навучальныя ўстановы — музычныя калсджы і вучылішчы, складас ад 8—10 да 15%. Выяўленчае мастацтва займае больш пачэснае мссца ў выпускнікоў мастацкіх школ — 50—55%. Самы высокі працэнт жадаючых пайсці ў «мастацкую» прафесію ў харэографаў — 58-62%. Тэатральнас мастацтва таксама папулярнае ў навучэнцаў — конкурсы ў ССНУ, ВНУ па гэтай спецыяльнасці стабільна высокія, што свсдчыць аб устойлівай цікавасці з боку дзяцей і падлеткаў да набыцця пачатковай мастацкай адукацыі. Разам з тым спецыялізаваных ССНУ тэатральнага профілю ў краіне няма.

Найбольшая колькасць сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў размешчана ў Мінску — сем і сем адпаведна. Прычым тры ВНУ — установы адукацыі сферы культуры і мастацтва. Па пяць устаноў адукацыі (ВНУ і ССНУ) размешчаны ў Віцебскай (2 і 3 адпаведна), Гродзенскай (1 і 4) і Магілёўскай (1 і 4) абласцях, па чатыры — у Брэсцкай (1 і 3) і Гомельскай (1 і 3). Мінская вобласць прадстаўлена адной сярэдняй спецыяльнай навучальнай установай — Маладзсчанскім музычным вучылішчам.

Музычнае мастацтва па напрамках прадстаўлена ва ўсіх шасці рэгіёнах краіны, уключаючы і Мінск. Харэаграфічнае — у Мінску і Магілёўскай вобласці, выяўленчае мастацтва і дызайн — пераважна ў Віцебскай і Гродзенскай абласцях. Таму ёсць тлумачэнне: ССНУ «завязаны» на «свае» вышэйшыя навучальныя ўстановы, мснавіта ў сярэдніх звёнах рыхтуюцца патэнцыяльныя абітурыенты для ВНУ.

Сістэма вышэйшай мастацкай адукацыі прадстаўлена трыма вышэйшымі навучальнымі ўстановамі культуры і мастацтва — дзвума акадэміямі (Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі, Беларускай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў) і Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў, падпарадкаванымі Мінкультуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У астатніх вышэйшых навучальных установах — такіх дзесяць — існуюць: асобныя факультэты, як у БДПУ імя М. Танка (факультэт эстэтычнага выхавання), ці спецыяльнасці, як у Інстытуце сучасных ведаў імя А. М. Шырокава (мастацтва эстрады), у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна (гісторыя сусветнай і айчыннай культуры, выяўленчае мастацтва, народныя мастацкія промыслы, музычнае мастацтва), Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя І. П. Шамякіна (музычнае мастацтва), Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы (выяўленчае мастацтва, камп'ютарная графіка, музычнас мастацтва, спецыяльныя музычныя дысцыпліны, дызайн, народная творчасць, харавая музыка) і інш.

У сувязі з гэтым ёсць патрэба вызначыць і абгрунтаваць прапарцыянальныя суадносіны ўстаноў адукацыі музычнага, мастацкага, харэаграфічнага і іншых профіляў з пункту гледжання іх запатрабаванасці ў грамадстве. Вялікі попыт на спецыяльнасці выяўленчага ці харэаграфічнага, тэатральнага мастацтва патрабуе павелічэння навучальных устаноў такога тыпу ў краіне, у тым ліку і на пачатковым этапе — у школах.

Айчынная сістэма мастацкай адукацыі была канчаткова сфарміравана напрыканцы саракавых гадоў мінулага стагоддзя. А першыя крокі па яе дасягненню былі зроблены яшчэ ў перыяд НЭПа, калі атрымала шырокае распаўсюджанне пачатковая мастацкая адукацыя ў выглядзе школ, кружкоў, а потым і сярэдняя спецыяльная — мастацкія тэхнікумы і вучылішчы. Пры гэтым усё фінансавалася дзяржавай. Фенаменальная масавасць пачатковага звяна мастацкай адукацыі і найвышэйшы прафесіянальны вынік у вышэйшым звяне — такі бліскуча дасягнуты вынік савецкай сістэмы мастацкай адукацыі.

Да пачатку 1990-х гг. ледзь не кожная трэцяя школа ў Беларусі з'яўлялася ўстановай з пэўным эстэтычным або мастацкім ухілам. БССР была тагачасным лідарам мастацка-эстэтычнай адукацыі ў СССР (разам з Арменіяй і Украінай). Акрамя таго, у 1980-х гг. школы з паглыбленым вывучэннем прадметаў мастацка-эстэтычнага цыкла былі толькі ў Беларусі і тагачаснай Прыбалтыцы.

Сёння ў школах з мастацкім ухілам рэзка скарочана наменклатура прадметаў і аб'ём гадзін, якія адводзяцца на іх выкладанне. Заняткі па мастацтву пераўтварыліся з перадпрафесійных у заняткі вольнага часу; быў выключаны з базавага вучэбнага плана і прадмет «Сусветная мастацкая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культура», які закліканы забяспечыць далучэнне ўсіх старшакласнікаў да класічных і сучасных твораў мастацтва. Рэспубліка Беларусь была першай краінай на постсавецкай прасторы, дзе курс «Сусветная мастацкая культура» быў уключаны ў базавы вучэбны план у якасці абавязковай дысцыпліны. На працягу пятнаццаці гадоў ствралася сістэма падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі настаўнікаў, якія выкладалі гэты прадмет. Рашэнне пытання па прынцыпу «няма прадмета — няма праблемы» ўяўляецца неабгрунтаваным з дзяржаўнага пункту гледжання. Гэта супярэчыць запытам грамадства і паніжае прэстыж нашай адукацыі на міжнароднай арэне.

У Савецкім Саюзе прадметам асаблівага клопату лічылася ідэйнае, патрыятычнае, працоўнае, маральнае выхаванне, якім было падпарадкавана выхаванне эстэтычнае. Савецкімі творчымі работнікамі, навукоўцамі, філосафамі, педагогамі, мастацтвазнаўцамі была зроблена вялікая работа па тэарэтычнаму асэнсаванню і практычнай арганізацыі эстэтычнага выхавання. Існавалі камісіі па эстэтычнаму выхаванню пры творчых саюзах. Ва ўніверсітэтах былі створаны кафедры эстэтыкі, у Акадэміі навук СССР і акадэміях савецкіх рэспублік функцыянавалі сектары ці аддзелы эстэтыкі. Велізарная работа праводзілася ў сістэме Акадэміі педагагічных навук. Працаваў савет па эстэтычнаму выхаванню пры Педагагічным таварыстве РСФСР. Існаваў грамадскі савет пры ЦК УЛКСМ і Акадэміі педагагічных навук, пры якіх функцыянавалі секцыі эстэтычнага выхавання. Работу па эстэтычнаму выхаванню праводзіла таварыства «Веды», універсітэты культуры, вячэрнія ўніверсітэты марксізму-ленінізму, творчыя саюзы. Пасля таго як запалілі чырвонае святло перад марксісцка-ленінскай ідэалогіяй, адначасова значна спрасцілі і сістэму эстэтычнага выхавання. Сёння, калі ў нас выкрышталізоўваецца новая ідэалогія, эстэтычнае выхаванне павінна заняць у ёй сваё пачэснае месца.

Такім чынам, будынак айчыннай мастацкай адукацыі і эстэтычнага выхавання па-ранейшаму складае былая сістэма, у фундаменце якой закладзена моцная фінансавая падтрымка з боку дзяржавы. Гэты будынак атакуе моцны вецер глабалізацыі, якая праз Балонскі працэс, праз Інтэрнэт і сродкі масавай інфармацыі (гэтакас стыхійнае эстэтычнае выхаванне) разгойдвае сістэму мастацкай адукацыі, якая склалася на сённяшні дзень. Культурны шок, выкліканы названымі падзеямі, дапаўняецца зменай арыенціраў у сістэме фінансавання галіны куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры і адукацыі, тэндэнцыяй аслаблення ідэалагічнай кампансnты і пранікнсннсм законаў рынкавай эканомікі ў сфсру мастацтва.

Як можна выправіць гэтую сітуацыю? Псрш за ўсё — выкарыстаць моцную заканадаўчую базу для культурнага выхавання асобы. Нагадасм, што мастацка-адукацыйны і эстэтычна-выхаваўчы працэсы здзяйсняюцца ў адпаведнасці з асноватворнымі дзяржаўнымі дакументамі, якія захоўваюць існаванне мастацкай адукацыі як цэласнай сістэмы, забяспечваюць гарантыі і правы кожнага грамадзяніна на яс непарыўнасць, ствараюць умовы для яе (мастацкай адукацыі) арганізацыі «праз усё жыццё», а таксама вызначаюць падыходы да працэсу эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі, якія таксама базіруюцца на прынцыпах непарыўнасці і пераемнасці выхаваўчай дзейнасці. Усё гэта абумоўлівае далейшае нарошчванне і развіццё інтэлектуальнага, культурнага і творчага патэнцыялу нацыі праз павышэнне якасці выхавання падрастаючага пакалення і ўсебаковую падтрымку развіцця асобы навучэнцаў.

Алс ж для таго, каб гэтыя дакумснты запрацавалі, нсабходна, па-першае, аб'яднаць намаганні і псраадолець міжведамасную раз'яднанасць паміж Міністэрствамі культуры, адукацыі і інфармацыі, стварыўшы адпаведную рабочую группу для вывучэння сітуацыі ў сферы культурна-эстэтычнага выхавання. Па-другое, трэба больш сістэмна выкарыстоўваць патэнцыял айчынных сродкаў масавай інфармацыі, у першую чаргу элсктронных, а таксама Інтэрнэт у мэтах эстэтычнага выхавання і прапаганды лепшых узораў айчыннай мастацкай культуры. Па-трэцяе, больш актыўна далучаць творчую грамадскасць, у першую чаргу творчыя саюзы, да эстэтычнага выхавання. Па-чацвёртае, трэба пашырыць навуковую базу для эстэтычных даследаванняў у Нацыянальнай акадэміі навук, у ВНУ культуры і мастацтваў. Па-пятас, знайсці механізмы для дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва ў сфсры культурна-эстэтычнага выхавання.

Гэтыя і іншыя напрамкі дзейнасці павінны быць прыведзены ў адзіную сістэму, работу над якой трэба неадкладна пачынаць з распрацоўкі навукова абгрунтаванай Канцэпцыі і Праграмы культурнага выхавання ў Беларусі, якія павінны сваім існаваннем адказаць на стратэгічнае, светапоглядное пытанне: ці захоўваць былую сістэму мастацкай адукацыі і эстэтычнага выхавання з яе дамінуючай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ідэалагічнай функцыяй, ці выбраць рынкавы шлях развіцця і падпарадкаваць сферу мастацкай адукацыі толькі эканамічным законам. Гэтыя кірункі пошуку не выключаюць знаходжання свайго асаблівага і непаўторнага трэцяга шляху.

***Лтаратура***


1. Беларуская культура сёння: гадавы агляд, 2010 / І. В. Анціпенка [і інш.]; пад агул. рэд. Т. І. Стружэцкага ; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Ін-т культуры Беларусі. — Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2011. — 144 с.

2. Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2010: статист. сб. — Минск: Национальный статистичсский комитет Республики Беларусь, 2010.-584 с.



***Summary***

*Artistically-educational and aesthetically-training processes are considered as an integral system of the artistic education, which is based on the principles of continuity and succession of the educational and training activity, creates conditions for education "during the whole life period" and provides training and preparation of the professional personnel for the sphere of culture and art.*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ